// Маладосць*09

Штомесячны
літаратурна-мастацкі
і грамадска-палітычны
ілюстраваны часопіс

(850) Верасень, 2024

Выдаецца з 1953 года

**ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР**

Вольга Станіславаўна РАЦЭВІЧ

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ**

Уладзімір АНДРЫЕВІЧ
Алесь БАДАК
Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ
Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ
Уладзімір МАТУСЕВІЧ
Людміла САЯНКОВА
Таццяна СІВЕЦ
Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ
Аляксей ЧАРОТА
Віктар ШНІП

«Маладосць»
у Мінску можна набыць у крамах
і павільёнах «Белсаюздруку»:
крама № 13,
плошча Перамогі, падземны пераход;
крама № 18, плошча Перамогі,
падземны пераход;
крама «Глобус»,
вул. Валадарскага, 16;
павільён № 79,
пр. Пераможцаў, 5;
а таксама ў аддзеле рэалізацыі
выдавецтва
«Мастацкая літаратура»,
пр. Пераможцаў, 11, каб. 924.

Рэдакцыя не ўступае ў перапіску
з чытачамі, не рэцэнзуе і не вяртае
дасланыя рукапісы.
Пры передруку спасылка
на «Маладосць» абавязковая.

**Адрас рэдакцыі**

Рэспубліка Беларусь, 220004,
Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 918.
Тэл.: 203-84-13, 203-83-63.
E-mail: maladost21@mail.ru; mail@mastlit.by

**Падпісныя індэксы**
*00592 — індывідуальны*
*льготны для настаўнікаў*
*74957 — індывідуальны*
*749572 — ведамасны*
*00731 — ведамасны льготны для ўстаноў*
*Міністэрства культуры*
*і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
сродку масавай інфармацыі № 16 ад 19.07.2021,
выдадзенае Міністэрствам інфармацыі
Рэспублікі Беларусь.

Выдавец
Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае
прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Дырэктар — Аляксандр Мікалаевіч БАДАК

Мастацкі рэдактар *М. Ю. Дайлідаў*
Тэхнічны рэдактар *Н. А. Арцёмава*
Стылістычны рэдактар *А. В. Казлова*

Падпісана да друку 09.09.2024.
Фармат 84×108 $^{1}/_{16}$. Папера лёгкамелаваная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,76.
Ул.-выд. арк. 10,12. Тыраж 425 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае
прадпрыемства «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61,
220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

*Адказнасць за дакладнасць цытат,*
*іх арфаграфію, пунктуацыю*
*і афармленне спасылак*
*на крыніцы нясуць аўтары.*

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2024
© Грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2024
© УП «Мастацкая літаратура», 2024

16+

# ЦІМАФЕЙ САВЯНОК

## Два апавяданні



Савянок Цімафей нарадзіўся 1 кастрычніка 2002 года ў Маладзечне, там жа вучыўся ў гімназіі № 6. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Цікавіцца пытаннямі экалогіі, дэфіцыту энерганосьбітаў, алічбоўкі чалавечага розуму, месцам рэлігіі ў сусвеце будучыні. Піша прозу. Лаўрэат Міжнароднага моладзевага анлайн-конкурсу навуковых і навукова-фантастычных работ «Гарызонт-2100». Жыве і працуе ў Мінску.

### Сямнаццаты

Трава была мяккая, шаўкавістая, кончыкі ейныя ледзь чутна казыталі ногі, чапляліся за вольнага крою нагавіцы. У бледным святле зорнай ночы сцяблінкі здаваліся цёмна-сінімі, быццам глыбокае возера. Босыя ступакі патаналі ў чорнай зямлі, пакідаючы няроўныя ямкі. Ледзь чутна гудзелі ды сакаталі рухомыя часткі скаціны. Прыгожы юнак у лёгкай адзежы з шэрае тканіны ішоў наперадзе статка, лёгенька памахваючы галінкай-маніпулятарам.

Янка любіў гэтае месца. Шырокае травяное поле на схілах невялікага ўзгорка, з якога разгортваюцца цудоўныя краявіды; сінявата-чорны ў цемры лясок за краем, што ціхутка шамаціць; самотнае дрэўца, што раскінула карону бліжэй да вяршыні. І — зоркі. Чамусьці адсюль лепей за ўсё было відаць зоркі.

Янку падабалася глядзець на зоркі. Зоркі — гэта жывая гісторыя. Проста цяпер яны апавядаюць тое, што здарылася пяць, дзесяць... тысячу гадоў таму. Варта толькі прыслухацца. А Янка любіў слухаць гісторыі зор. Але яшчэ болей ён любіў слухаць гісторыю Зямлі.

Юнак кругавым рухам махнуў галінкай, і статак паслухмяна разышоўся па полі, размеркаваўся так, каб паглынуць максімум травы пры мінімальных выдатках. Шаматлівая цішыня поля напоўнілася ледзь чутнымі гудзеннямі, пашчоўканнямі ды сакатаннем. Ян жа ўладзіўся пад дрэўцам. Крона ў дрэва была рэдкая, ды й само яно расло крывенькае, нязграбнае пад уздзеяннем ветру. Але тут было ўтульна.

Пастух дастаў з шырокай торбы загорнутыя ў тэрмаўстойлівую плёнку брыкеты апрацаванай біямасы.  Пастрасаўшы іх на зямлю, ён пасцяліў плёнку на прагалку пад дрэўцам і ўзяўся складаць брыкеты дамком. Такія штукі даюць разоў у пяць болей

# МАРЫЛЯ БУЙНА

## Вершы без людзей



Марыля Буйна нарадзілася 5 верасня 2004 года ў Гомелі. Скончыла гімназію № 56 г. Гомеля. Цяпер студэнтка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

### Адлюстраванне

Хрыбет ад рыбы, сем рагоў, у зрэнках — соль адна.
Я памятаю, хто ты, толькі не магу пазнаць.
Трынаццаць рук, і ў кожнай корд — памкнуліся вакол,
І як ні кінь, у лоб свой трапіш — так спакон вякоў.

Бязлітасны й бяздушны да сябе быў твой урок.
Мне дай адказ: ці лёгка есці ўласнае нутро?
Прызнайся, у маўчанні ты прытулку не знайшла,
Ці ж не затым цябе ўладар на гэты свет паслаў?

Скажы, каханка творчых сіл, ці прымеш ты мараль
Той веры, што сцвярджае: «Сорам голас твой забраў»?
Калі ў цябе ад муз усіх адзіны штрых благі,
Нарэшце годнасці здранцвелай разраўняй прагін.

Вазьмі ад пеўня галаву і ногі ад змяі,
Шклянога мозга счырканага клеткі замяні.
У кожнай быў калісь злы бог, што аддзяліў душу
Ад абалонкі, здатнай сцішыць рытму сэрца шум.

Калі ўвядзеш у вену ўсё-ткі з воцатам іглу,
Ты не дзівіся, як адчуеш у пражылках глум.
Няма чаго шукаць заган і ўтоеных прычын —
Няўжо ты лічыш, што магчыма ад сябе ўцячы?

# АЛЯКСЕЙ ДЗЯМІДЧЫК



## Вусач

Апавяданне

Дзямідчык Аляксей нарадзіўся 4 кастрычніка 1991 года ў Барысаве. Скончыў тэатральную кафедру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама магістратуру Расійскага дзяржаўнага інстытута сцэнічных мастацтваў. Займаецца пастаноўкай спектакляў і напісаннем сцэнароў для ўласных тэатральных работ. Літаратурны дэбют у «Маладосці».

Аўтобус з Барысава на Плешчаніц ад'язджае два разы на дзень. Першы ідзе а палове восьмай раніцы, другі — днём, а палове на чацвёртую. Да Каці я збіраўся ехаць зранку, але пасняхова праспаў. Стома пасля двух месяцаў бесперапыннай працы ў тэатры змусіла мяне спаць амаль да гадзіны дня.

Нават збіраючыся на другі рэйс, я сумняваўся, ці ехаць. Каця мяне моцна кахала і чакала, мая шалапутная творчая натура яе фанатычна вабіла. А для мяне ўтульнае плешчаніцкае лецішча яе бацькоў было неблагім месцам, дзе мы цягам ночы спрабавалі аднавіць нашы амаль згаслыя, прывідныя пачуцці. Я раз за разам жарсна патанаў у гарачыні яе цела, марна дорачы дзяўчыне надзею, што ў нас усё складзецца. Насамрэч жа мне хацелася іншых адносін: больш сур'ёзнага і моцнага пачуцця — кшталту рамантычнага кахання, апісанага ў літаратурных творах, якое б зацягнула мяне ў свой няўрымслівы вір.

Паглыбіўшыся ў думкі, згрызоты ды сумневы, я прабадзяўся па Барысаве амаль да вечара, наўмысна прапусціўшы другі, дзённы, аўтобус. Настрою не было. Чым больш я глядзеў на пустыя барысаўскія вуліцы, тым мацней на мяне находзіла туга ад разумення, што так бязглузда праводжу першы з трох сваіх выходных.

Пачуццё роспачы, змяшанае з віной перад Кацяй, што абяцаў ды не прыехаў, ахапіла напоўніцу. Я зразумеў, што сумую па цеплыні яе цела і хачу правесці з ёй тры цудоўныя дні, каб потым развітацца назаўжды. Таму вярнуўся дахаты ды пачаў збірацца. Хутка склаў свае рэчы, прыхапіў бутэльку каньяку (дарога магла заняць шмат часу) і ўвесь ганарар за апошнюю пастаноўку. Хацелася шыкануць ды ад юнацкай бязглуздасці скупіць увесь алкаголь у плешчаніцкіх крамах. Каця мусіла ацаніць такі ўчынак.

# САША ТЭМЛЕЙН



## Пагорак

Апавяданне

Тэмлейн Саша (сапр. Змушко Аляксандр) нарадзіўся 10 красавіка 1981 года ў Мінску. Скончыў біялагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З'яўляецца навуковым супрацоўнікам аддзела біятэхналогіі Інстытута пладаводства НАН Беларусі.
Празаік, працуе пераважна ў жанрах навуковай фантастыкі, філасофскага і гумарыстычнага фэнтэзі, альтэрнатыўнай гісторыі. Аўтар звыш дваццаці апавяданняў і рамана «Конкурс "Міс Галактыка"». Творы публікаваліся ў рэспубліканскім і расійскім перыядычным друку, а таксама калектыўных зборніках фантастыкі выдавецтва «Эксмо».

Саша сядзеў на Пагорку.

Даволі дзіўны занятак для дзевятнаццацігадовага хлопца, але яму было хораша. Ногі звісалі ў прорву, парослую зялёнай травой, зверху паўзлі аблокі, падобныя да зефірных чалавечкаў, драконаў, якія злавілі свой хвост, і на пудынгі. Было цёпла. Пагорак ляжаў велічна і прывольна, раскінуўшыся сярод шматпавярховак, хуткасных шасэ і гіпермаркетаў.

Тут было ўтульна і ціха, амаль не чуваць вуркатання вялікага горада. Аазіс спакою, возера старажытнасці, запаведнік цішыні. Сонца залівала паўдзённым золатам яго малахітавыя бакі, бетонныя сцены, якія ўмацоўвалі яго падобна контрфорсам, дахі невялікіх крамак, лістоту невысокіх дрэў. Так, і тут былі шматпавярхоўкі, але яны былі ціхія і загадкавыя, нібы іх насялялі нябачныя смяротныя эльфы.

Саша гуляў на Пагорку з самага дзяцінства. Ён праходзіў кіламетры па бетонных борціках, гадзінамі не ступаючы на цвёрдую зямлю, балансуючы над прорвай у тры метры, хапаючыся за кусты і траву, каб не ўпасці. Ён ведаў Пагорак лепш за свае пяць пальцаў. Ён ведаў, што ў адной краме прадаюць арэшкі ў васабі, зялёныя і вострыя, як перац чылі. Ён ведаў месцы, дзе Пагорак пераходзіць у яры завода, вялізныя яры, запоўненыя каменьчыкамі дзіўнай пароды — порыстай і зялёнай, як малахіт. Ах, тут былі цудоўныя мясціны, калі з тэрасы, перагнуўшыся цераз парэнчы, унізе можна ўбачыць дахі прыватных дамоў і мірную сямейку, што смажыць шашлыкі ў сябе на двары. Ярусны горад, які прыступкамі ўздымаўся ўсё вышэй да сонца, быццам Мінас Ціры́т, і Саша сядзеў на самай высокай яго прыступцы.

Ён ведаў, дзе можна ўзлезці на схілы Пагорка напрасткі, рызыкуючы сарвацца і разбіцца, а дзе можна бегчы, не баючыся пераламаць сабе ногі, хутчэй ветра, што падганяе аблокі ў паднябессі.

# ТАЦЦЯНА МАРОЗАВА



## І на чым яна трымаецца

Апавяданне

Марозава Таццяна нарадзілася 24 кастрычніка 1971 года ў Мінску. Скончыла факультэт рускай філалогіі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. Працавала бібліятэкарам у Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэцы і іншых установах. Творы ўвайшлі ў зборнік апавяданняў «Пишу каждый день» (2023). Жыве і працуе ў Мінску.

Здавалася, што іх ніхто не бачыць. Людзі, што зрэдку сустракаліся па дарозе, глядзелі — і позіркі ляцелі міма, не затрымліваючыся на іх постацях. Вандроўнікі былі з нейкага невядомага людзям свету. Мусіць, і законы там зусім іншыя: і тое, што відавочна ў чужым свеце, губляе сваё аблічча на Зямлі.

Калі прыгледзецца, дык выглядалі яны зусім як людзі. Звычайныя тры дзеда.

Першы здаваўся зусім нямоглым: сухенькі, згорблены, са зблытанай сівой барадой. Звалі яго Хейл. Часам стары моршчыўся і паціраў локаць правай рукі: боль даўно стаў яго нязменным спадарожнікам. Касматыя бровы амаль закрывалі вочы... Вочы, што выпраменьвалі дзіўную сілу і цвёрдасць.

Пры поглядзе на другога ў любога магла б з'явіцца ўсмешка: столькі хлапечага запалу і непасрэднасці было ва ўсім яго вобразе. Мяккая ўсмешка раз-пораз з'яўлялася на твары Рэя. Ён з захапленнем разглядаў усё, што было побач, быццам навакольнае яму ў навіну. Такімі вачамі глядзяць дзеці. Нават непаслухмяныя пасмы сівых валасоў ніяк не старылі гэты дзіўна малады твар. Вось толькі рукі... маршчыністыя, сухія, з надзьмутымі венамі і ледзь дрыготкімі пальцамі. Далоні гэтых рук трымалі памяць мінулых дзесяцігоддзяў.

* * *

Вазок рыпеў, перавальваўся на выбоінах, падаў старымі драўлянымі коламі ў калдобіны, чапляўся за вострыя камяні. Вось і зараз, здавалася, ён намёртва завяз у яме, напоўненай вадой.

— Так, дарога ўсё горш і горш,— задуменна сказаў Хейл. Ён кінуў вяроўку і пайшоў вызваляць кола.

— Мы ж кожны раз ідзем па новай дарозе,— усміхнуўся трэці стары і накіраваў-

# ВІКТАР ШНІП



## Жыццё — як агонь...

Вершы

Шніп Віктар нарадзіўся 26 сакавіка 1960 годзе ў вёсцы Пугачы Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум і Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў у часопісе «Беларусь», у газеце «Наша слова». У 1995—2004 гадах — намеснік галоўнага рэдактара і галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Цяпер — намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя».
Аўтар кніг паэзіі і прозы «Гронка святла», «Пошук радасці», «Шляхам ветру», «На рэштках Храма», «Воўчы вецер», «Беларускае мора», «Балада камянёў», «Страла кахання, любові крыж», «Проза і паэзія агню», «Пугачоўскі цырульнік», «Сабачыя гісторыі», «Першы папяровы снег», «Заўтра была адліга», «Трава бясконцасці», «Васільковы мёд» і інш. Лаўрэат прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага, літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі і інш.

✦ ✦ ✦

Выць век ваўкам на крывавую поўню.
Сонца ніколі не бачыць кратáм.
Хто ты і чый ты? Нічога не помніш.
І ўжо не хочаш даведацца сам.

Вецер па полі ганяе лістоту,
Што без пары абляцела з бяроз.
І не вяртаюцца пчолы без мёду,
І немагчыма расстацца без слёз.

З бацькам сяджу каля дзедавай хаты.
Слухаю бацькаў расповед пра нас.
І на душы невымоўнае свята,
І пралятае нам дадзены час.

І ўжо адзін я іду па дарозе.
Думаю думу, гляджу ў небакрай.
Нехта знаёмы праехаў на возе
І не спыніўся, бы ехаў у рай.

Выць век ваўкам на крывавую поўню.
Сонца ніколі не бачыць кратáм.
Хто там на возе праехаў? Не ўспомню.
Толькі, магчыма, я сам ехаў там...

✦ ✦ ✦

Ва ўсім ёсць сэнс, і нават у маўчанні
Ёсць сэнс, як і ў каменнях спіць вада.
Не мае сэнсу ўноч чакаць світанне,
Світанне прыйдзе, і пчала ў садах
Пачне свой дзень, як вечна пачынала,
Свой вулей пакідаючы, каб мёд
Збіраць, як сто разоў дасюль збірала,
Не абмінаючы ў палях асот.
Ва ўсім ёсць сэнс, і сэнсу не шукаеш,
Бо бессэнсоўна ў мёдзе мёд шукаць.
Раскідаўшы каменне, ты збіраеш,
Каб потым зноўку іх параскідаць.

*На факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта падвялі вынікі рэспубліканскага літаратурнага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар», які цяпер носіць імя У. А. Капцава. Да пастаянных намінацый — «Студэнцкая проза», «Студэнцкая паэзія», «Школьная проза», «Школьная паэзія» — дадалася новая — «Сцэнарыі камп'ютарных і настольных ролевых гульняў». Прапануем лепшыя творы лаўрэатаў конкурсу. Знаёмцеся!*




Фота С. Рабцава

# ПАЭЗІЯ

## Маргарыта Стрыевіч

### Дазволь

Табою мне надыхацца дазволь,
дазволь мне закахацца лютай сцюжай.
Дазволь заблытацца ў такім густым валоссі
і постаць абхапіць да болю дужа.

Дазволь спазнаць мне смак мядовых вуснаў,
прынесці цэлы свет ў далонях для цябе.
Дазволь намаляваць мне твой партрэт
у кветках, рэках, у чароўным сне.

Так я прасіў, так я маліў і верыў,
што прыйдзе час світальнае зары,
калі у шэраг сыдуцца планеты
і нас звядуць гарачыя агні.

Вось я і тут, стаю ў тваім пакоі,
распяты за усе свае грахі.
А ты маўчыш, трымаючыся годна,
і ужо больш не падасі сваёй рукі...

# Раман Гадун

## Размова з жабракамі

*Паводле фота беларускіх жабракоў 1910 года, «Беларускі каляндар»*

Што ж вы, хлапцы́, ды галовы павесілі,
Што ж вы, нязграбныя, у шэраг пасталі?
Ці паны вам пашаны замала адвесілі,
Ці жандармы да сценкі прымусна паставілі?

Што ні скажаце,
хлопцы,— паверу адразу вам,
Бо не схлусіць ваш позірк жабрацкі,
пануры.
Бо не знойдзецца дзень,
што б хоць раз вас парадаваў,
З усіх колераў ваш — гэта брудны і буры.

Бачу, шмат часу па свеце блукаеце,
Ды нарэшце стаміліся, сталі у полі
І ўжо век нерухома на фота чакаеце —
Без абутку, надзеі, Радзімы і долі.

І сто год ваша ліра не вальсамі льецца,
А мальбою пра ежу ды ноч пад страхою.
Хлеба штодня прагнуць страўнік і сэрца.
Просіце дробязь дрыжачай рукою.

Няма каму даць — усе паселі па сховішчах
І, паеўшы, напышліва мацаюць скроню.
На маёнтках цытуюць лірызм Багдановіча,
Я ж пра вас, мае слёзныя, помніў і помню.

Тых няма, жабракі, хто б за вас заступіўся,
Хто б з балотаў ваш голас галодны данёс.
Мусіць, з пекла на вашыя душы скаціўся
Маўклівы, цярплівы, пакутніцкі лёс.

То прыміце ж, жабрацтва,
гаротніцкім помнікам
З маіх словаў са смуткам сатканы вянок,
Каб на момант хаця б прыпынілася тонкая
Ваша песня з тужлівых ды шэрых аблок.

# Ангеліна Мацюшонак

## Я пастаўлю белую кропку

Я пастаўлю белую кропку.
А потым дастану касету.
Так, тую самую, з лета...
Каб засталося яно назаўсёды.

Я пастаўлю белую кропку
На палатно, чарнёнае ў сажу.
Больш ні фарбы на яго не намажу,
Будзе зорка адна, між агаркаў.

Былое гаворыць, трымаючы скрыпку,
Рэхам праз думкі на волю цячэ.
Ды скрыпку ў рукі — жылося б лягчэй!
Але чыркану нябачную белую кропку.

Робіць прызму магчымага зноўку
Кавалак надзеі, застылы ліхтар.
На месцы думак гучных быў пажар,
Але ўжо не відаць з-за сажы тую зорку...

# ПРОЗА

# Лера Гілеўская

## Сказ пра мяне, царкву і д'яблаў

— Дзіцятко, мы збіраемо на адбудоўлю нашай царквы,— старая жылістая далонь схапіла мяне за запясце.— Дапамажы чым можаш, без царквы ж нельга, ты разумееш. Вось будзе ў цябе няшчасце, а яно абавязкова будзе, не дай божа. А ён там,— палец, нават не з пазногцем, а з кіпцюром, пачаў тыкаць кудысьці, дзе зараз пралятаў ваенны верталёт,— усё бачыць, табе ўсё вернецца. Ну, не пашкадуй, дзіцятка.

# РАГНЕД МАЛАХОЎСКІ:

## «У маім выпадку кожны радок, кожнае слова не спяшаюцца быць агучанымі»



*«Думак рух уздымаецца кіпенем... // Не паэт той, хто ісціны страшыцца. // А паэзія дыхае ліпенем // І даверлівай коткаю лашчыцца...» Першы паэтычны зборнік Рагнеда Малахоўскага «Беражніца» выйшаў, калі паэту было 20, і стаў яркай падзеяй у літаратурным свеце. Тады юнак, які трапіў у творчую гушчу такіх аўтарытэтаў, як Мікола Мятліцкі, Раіса Баравікова, Віктар Шніп, Людміла Рублеўская, і не падазраваў, што атрымае білет у літаратуру. Сёння Рагнед Малахоўскі намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, рэдактар аддзела паэзіі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», святкуе ліпень свайго жыцця, які, безумоўна, дыхае паэзіяй і творчасцю. Што даў жыццёвы вопыт, дзе шукаць натхненне і як узаемадзейнічаць з калегамі і старэйшымі — у нашай гутарцы...*

● ***— Гартаючы твае зборнікі паэзіі, асабліва вылучаецца першы. Маладосць для паэта — недахоп ці перавага?***

● — Маладосць спрыяльная для ўсяго, але не значыць, што ў сталым узросце паэзія — не тое, чым варта займацца. Вядома, у маладосці не хапала жыццёвага вопыту, начытанасці, затое былі абвостраныя пачуцці, больш наіву, рамантызму. А ўсё гэта разам можа пераўтварыцца ў адметную паэзію. У сталым жа ўзросце, наадварот, з'яўляецца жыццёвы вопыт. Многія рэчы і падзеі ўспрымаеш не пачуццямі, а розумам, аналізуеш. І паэзія, такім чынам, іншая. Але ад гэтага яна не робіцца дрэннай. Сёння, напрыклад, многія радкі са сваёй першай кнігі мне хочацца перапісаць, нешта ўдасканаліць, дапрацаваць. Але, лічу, па вялікім рахунку, гэта рабіць не трэба, бо пісаў іх, можна сказаць, іншы чалавек, і варта пакінуць як ёсць. Толькі ў выпадку выпраўлення яўнай недакладнасці, хіба, русізма, напрыклад. Папраўіць можна, але перапісваць — не.

● ***— Хіба там ёсць што перапісваць?! Твой першы зборнік уражвае філасофіяй і глыбокімі разважаннямі: «Боль, выліты***